“ Музычныя вітражы”- калекцыя твораў для фартэпіяна сучасных беларускіх кампазітараў. Упершыню Беларускі Саюз кампазітараў аб’ядноўвае ў зборніку аўтараў, якія жывуць як у Беларусі, так і за яе межамі.
Яркія, вельмі розныя па музычнай мове і настрою сачыненні складаюць адмысловы малюнак сучаснай музыкі Беларусі.

Мы склалі зборнік, прадстаўлячы п’есы ад простых да больш складаных. У пачатку вы знойдзеце творы для зусім юных піяністаў, далей- музыку для вучняў сярэдніх і старэйшых класаў, а напрыканцы - больш складаныя п’есы, якія могуць выконвацца навучэнцамі сярэдніх спецыяльных і нават вышэйшых навучальных устаноў.

Музычныя жанры і характары, прадстаўленыя ў зборніку, вельмі разнастайныя. Джазавыя, па-дзіцячы жыццярадасныя матывы п’ес Ніны Сіняковай знаходзяцца ў суседстве з фальклорнымі, у нечым таямнічымі вобразамі музыкі Валерыя Воранава. Шчодра расфарбаваныя, поўныя энергіі “Каляровыя старонкі” Ларысы Мурашкі адценены п’есамі Аляксандра Іванова з іх пяшчотнымі, крохкімі матывамі. “Зімовыя канікулы” Віктара Войціка, напоўненыя радасным прадчуваннем Новага года, змяняюцца далікатнымі матывамі “Танца павучкоў” Алега Хадоскі, а далей і паэтычнымі, з мяккімі гармоніямі п’есамі Віктара Кажухара .
П’есы Кацярыны Гігевіч- две кантрастныя карціны: кранальная «Прэлюдыя» і забаўны, вельмі рытмічны «Танец кухараў».
«Вальс” і “Танга” Зміцера Астанькова спадабаюцца аматарам класічных жанраў. Рамантычная, з багатай фартэпіяннай фактурай “Элегія” Віктара Кісценя знаходзіцца ў яркім кантрасце з дынамічным, у чымсьці жорсткім «Скерца» Вячаслава Пяцько. Напоўненыя свежым паветрам «Прэлюдыя» і эмацыянальны «Вальс» Зміцера Лыбіна закрываюць зборнік разам з характарнай, па-свойму мудрагелістай п’есай “Лялькі танчуць балет” Зміцера Яўтуховіча

Незалежна ад месца жыхарства, аўтары, прадстаўленыя ў зборніку, застаюцца беларускімі кампазітарамі, адчувая сябе часткай роднай краіны. Спадзяемся, творы гэтага зборніка прынясуць задавальненне і выканаўцам, і настаўнікам, і слухачам.

Ніна Сінякова,
Укладальнік зборніка
кампазітар, піяністка
выкладчык фартэпіяна

Філядельфія, 27 кастрычніка 2019 г.